**Тэматычная экскурсія “З гісторыі паходжання назваў вёсак Першамайскага сельсавета Шчучынскага раёна, Гродзенскай вобласці”**

Добры дзень, паважаныя госці! Вы знаходзіцеся ў пятай зале гісторыка-краязнаўчага музея “Гісторыя развіцця Першамайскага дзіцячага сада-сярэдняй школы”. Сягодня ў час нашай экскурсіі мы пазнаёмім вас з гісторыяй паходжання назваў вёсак Першамайскага сельсавета.

Вельмі цікавае паходжанне нашых навакольных вёсак. Найперш мы вам раскажам пра населеныя пункты, якія ўзніклі ад імён першасяленца ў іх:

1. ВЁСКА БЯНЬКІ. Ёсць два меркаванні аб паходжанні назвы дадзенай вёскі. Першае- ёсць легенда, што даўным-даўно на месце цяперашняй вёскі было паселішча пана БЕНКІ. Другое- ад старажылаў сяла мы даведаліся, што назва вёскі ўзнікла ад прозвішча людзей, якія ў вельмі даўнія часы жылі тут. Прозвішча ў іх было БЕНКЕ.

2. ВЁСКА КУЛЯШЫ. Назва вёскі узнікла ад прозвішча КУЛЕШ. У 1600 годзе жыў пан. Ён меў вялікае памесце, жыў вельмі багата. У яго было многа слугаў, якім ён даваў дамы, якія называліся “чваркі”. Гэтыя слугі паступова стваралі свае сем’і і жылі ў гэтых дамах. Так час за часам павялічвалася колькасць насельніцтва ў гэтых месцах і колькасць сямей. Ужо ў 1620 годзе налічвалася 50 “чваркаў”. Пан, які пасяліўся першы на хутары, меў вельмі цікавае прозвішча - КУЛЕШ. Так як ён быў вельмі добрым чалавекам, то па яго прозвішчу і далі назву вёсцы КУЛЯШЫ.

3. ВЁСКА КУДЗЯРКІ. Назва вёскі ўзнікла ад прозвішча першага пасяленца - КУДЗЕРКА. У цяперашні час у вёсцы жывуць сем’і, у асноўным, па прозвішчу КУДЗЕРКА.
4. ВЁСКА ПЕТРАШЫШКІ. Назва вёскі паходзіць ад прозвішча ПЯТРАШКА, якое ў сваю чаргу ўзнікла ад імені ПЁТР.
5. ВЁСКА ТАБАЛІЧЫ. Назва вёскі ўзнікла ад прозвішча ТАБАЛА.

ІІ. А зараз, паважаныя госці, мы паведаем вам гісторыі паходжання населеных пунктаў, якія ўзніклі ад назваў ракі, раднікоў.

ВЁСКА СКАРБЫ.

Вядома некалькі паданняў, звязаных з паходжаннем назвы вёскі СКАРБЫ. Пешая з іх, найбольш верагодная, гаворыць аб тым, што даўным-даўно ў гэтых краях жыла прыгожая дзяўчына. Яе прыгажосцю захапляліся ўсе, хто хоць раз дзяўчыну ўбачыў. Больш за ўсё любіла прыгажуня гуляць па беразе безымяннай рачулкі, якая працякала непадалёку ад яе дома. Аднойчы дзяўчына рвала на лужайцы каля рэчкі кветкі, спляла іх у вянок, назіраючы, як пляскочуць у вадзе рыбкі. І тут яна ўбачыла незвычайна прыгожую кветку з белымі ляпесткамі, якія падымаліся з вады. Дзяўчына папыталася дацягнуцца да яе і сарваць, але саскальзнула з мокрага пальца ў ваду залатое кальцо, што падарыў ёй яе любы, адыходзячы на вайну. Горка плакала прыгажуня, толькі, хто ні падыходзіў да гэтага месца, кожны бачыў, як у глыбокай глыбіне ззяў той пярсцёнак пад патокамі ракі. Здавалася, што там ляжыць цэлы клад. Паспрабуе хто залесць у ваду – нічога не знаходзіць, а як асядзе мутнасць – ізноў блішчыць золата. Пайшлі чуткі, што ў рэчцы закалдаваныя “скарбы” ляжаць. Сталі прываблівадь тыя чуткі людзей, якія дружна сяліліся на прыгорку каля рэчкі, а вёску так і называць сталі: СКАРБЫ. З цягам часу націск у слове перайшоў на апошні склад – СКАРБЫ.

Па другім паданні, калісьці на месцы вёскі жыў са сваімі сынамі вядомы на ўсю акругу СКОРБ - майстар, які вырабляў скуры жывёл. А шылі з іх ужо іншыя майстры кажушкі і паўшубкі, шапкі і рукавіцы, боты і чаравікі. Сыны гэтага майстра, а іх было трое, перанялі бацькоўскую навуку, працавалі таксама вельмі старанна. А як пажаніліся, то аддзяліліся ад бацькі, паставілі непадалёку ад бацькоўскага свае дамы, але майстэрняй карысталіся адной на траіх - бацькінай. Вельмі выгаднае месца было: вада з рэчкі пад прыгоркам падавалася да майстэрні па спецыяльным латкам у вялікія бочкі і чашы, адходы сцякалі ў балота па выкапаным канаўкам. Жылі браты СКАРБЫ паміж сабоў вельмі дружна, людзей не абманвалі, бралі за работу нядорага, пагэтаму ішлі да іх і ехалі адусюль. Браты мелі многа работы, жылі багата, мелі многа дзяцей – памочнікаў, якія выраслі, стваралі свае

сем'і і сяліліся побач, але рамяство дзедава не пераймалі, так як ужо з'явіліся заводы па перапрацоўцы скуры ў гарадах. А вёска, канечне, яшчэ пры жыцці тых майстроў называлася СКАРБЫ.

III. А цяпер паслухайце, калі ласка, гісторыю ўзнікнення вёскі, назва якой залежыць ад роду дзейнасці людзей.

1. ВЁСКА ДУДКІ. Калісьці на месцы дадзенай вёскі шумеў цёмны лес, непраходнае балота пужала людзей. Ніхто сяліцца не хацеў тут, покуль не паявіліся ў гэтых месцах два браты – музыканты. Доўга хадзілі яны па свету ў пошуках лепшай долі. Ды ўсюды, дзе людзі, - людское няшчасце, бяда ды гора. А тут прыгожа, ціха, рэчка непадалёку. А галоўнае, ёсць з чаго хлопцам дудкі майстраваць. Дый як прыгожа гралі дудары – дудкі! У чароўных руках чуўся і шум дрэў, і срэбны звон раднікоў, і птушыны гоман. Ніхто не мог раўнадушна прайсці каля музыкантаў: астановіцца, заслухаецца, забудзе аб цяжкасцях. Многія спецыяльна прыходзілі паслухаць братоў. А многія і заставаліся тут, будавалі жыллё. Вестка аб чароўных “дударах” шырока разнеслася па наваколлі, прываблiваючы сюды просты люд. А ад тых братоў - музыкантаў з пакалення ў пакаленне сярод мясцовых жыхароў многа музыкантаў, нямала мастакоў і людзей, улюбёных у прыгожае, багатых душой. Так і ўзнікла вёска ДУДКІ.

2. ВЁСКА ПЛЯНТЫ. Назва ўзнікла ад слова “плянтаваць”, што абазначае выкарчоўваць. Назва надзела ўзгаранай зямлі на месцы раскарчаванага лесу.

IV. Паважаныя госці! Цяпер мы важ раскажам гісторыі ўзнікнення населеных пунктаў, якія залежаць ад месца знаходжання:

1. ВЁСКА СТАРЫ ДВОР. На гэтым месцы размяшчаўся панскі двор. Назва з асновай “двор” шырока было распаўсюджана на тэрыторыі Беларусі. Двор - агароджаны надзел зямлі, дзе знаходзяцца хаспадарчыя пабудовы. Іншы раз слова “двор” ужываецца ў сэнсе “гаспадарка”.
2. ВЁСКА СТАРАДВОРЦЫ. Так называліся паселішча залежных сялян, размешчаных непадалёку ад панскіх двароў. Адсюль і пайшла назва дадзенай вёскі.

3. ВЁСКА ЗАЛЯШАНЫ. Назва гаворыць сама за сябе - размешчаны за лесам.
4. ВЁСКА ЗАМАСЦЯНЫ. Назва гаворыць аб тым, што населены пункт размешчаны за мостам.
5. ВЁСКА ПАДГАЛІШКІ. Назва паходзіць ад таго, што паселішча знаходзіцца побач з голым месцам, адкрытай прасторай.

V. Паважаныя госці! Паслухайце, як цікава ўзніклі населеныя пункты, якія залежаць ад віду расліннасці і пароды дрэў, ад назваў жывёл і птушак.,

1. ВЁСКА ВЕРАБ'І. У аснове слова “верабей”. Каля гэтай вёскі многа кустарнікаў, дрэў. Мабыць, птушкам , асабліва вераб'ям, тут вельмі да спадобы. Адсюль і назва вёскі.

2 ВЁСКА ЗУБРАВА. Пасяленне знаходзіцца ў лесе, дзе, як і меркавалася, вадзіліся зубры. Ад назвы гэтых магутных жывёл і пайшла назва дадзенай вёскі ЗУБРАВА.

2.ВЁСКА ВЕНЗАЎШЧЫНА. Узнікла ад польскай формы назвы ВЯЗОВЩИНА. У аснове слова назва дрэва “ВЯЗ”.

3 .Вельмі цікавае паходжанне вёскі ГАЙКОЎЦЫ. Спачатку, чым пачаць ачышчаць месца ад лесу для вядзення гаспадаркі, земляроб прыглядаўся да парод дрэў. Найбольш ураджайнай была зямля пасля дуба,

ліпы, бярозы, гэта значыць змешанага лесу. Іменна пагэтаму так называецца дадзеная вёска, якая знаходзіцца на месцы былога лесу – "гая".

4. ВЁСКІ СТАРЫЯ ПАДДУБЫ. НОВЫЯ ПАДДУБЫ. На гэтым месцы калісьці рос дубовы гай. Адразу было заснавана паселішча ПАДДУБЫ, але з цягам часу побач з гэтым населеным пунктам узнік яшчэ адзін. І тады ПАДДУБЫ сталі СТАРЫМІ ПАДДУБАМІ, а новае паселішча – НОВЫМІ ПАДДУБАМІ.

5 ВЁСКА ТАБАЛІЧЫ. Назва вёскі паходзіць ад прозвішча ТАБАЛА.

6. ВЁСКА ВУГАЛЬНІКІ. Назва дадзенай вёскі азначае зямельныя надзелы - асабнякі, узятыя пад апрацоўку за агульнай граніцай, напрыклад, у лесе.

7. ВЁСКА ШАСТАКІ. Назва вёскі паходзіць ад старажытнага дахрысціянскага ўласнага імені ШЭСТАК - шосты сын у сям'і.
8 ВЁСКА ЮШКАЎЦЫ. Як гаворыць паданне, у старажытныя часы ў гэтых месцах былі крывавыя бітвы са шведамі. Зямля была заліта крывёю – "юшкай". Адсюль і пайшла назва вёскі.
9 ВЁСКА ПАГАРЭЛЕЦ. Вельмі цікавая гісторыя ўзнікнення дадзенай вёскі. Гэты населены пункт заснаваў чалавек, чыя гаспадарка калісьці згарэла ў агні.

10. ВЁСКА КУРПІ. Гэта назва населенага пункта ўзнікла ад этнаніма "курпі" - жыхары раўніны КУРПЁЎСКАЙ, якая знаходзіцца ў ПОЛЬШЧЫ на МАЗОЎШЫ, непадалёку ад граніцы з РЭСПУБЛІКАЙ БЕЛАРУСЬ.
11. ВЁСКА МАТЫЛІ. У аснове ўзнікнення назвы гэтай вёскі можа быць слова балтскага паходжання "МОТЛЕ" - маці. Гэта, напэўна, так, таму што вёска знаходзіцца на граніцы з ЛІТОЎСКАЙ РЭСПУБЛІКАЙ.

12. ВЁСКА ПЯЦЮЛЕЎЦЫ. На скрыжаванні дарог па аповедам старых людзей некалі стаяла карчма. Любілі вяскоўцы і хутаране з усіх наваколляў пасля работы выпіць там кубачак піва ці кілішак віна, падзяліцца навінамі. А на вялікія святы моладзь арганізоўвала там гулянкі. І ўсё было бы добра, каб не павадзіўся ў таверну па начах злодзей. Краў ён нямнога, але рэгулярна. І тады гаспадар рашыў злавіць злодзея. Расставіў на подступах да карчмы сілкі з пятлёй на ноч і стаў чакаць. Пад ранак ён і папаўся. Стаў прасіць, маліцца - канечне ж, баяўся застацца без рукі. Чым закончылася гэтая гісторыя - невядома. Толькі людзі здзіўляліся, хвалячы гаспадара тракціра: "Гэта ж трэба, - казалі яны, - злавіць злодзея петлямі". З цягам часу людзі сталі будавацца паблізу карчмы. Так узнікла вёска, якая ў памяць аб тых петлях і называецца ПЯЦЮЛЕЎЦЫ. Па другой версіі назва вёскі ПЯЦЮЛЕЎЦЫ ўзнікла ад памяншальна – ласкальнага імені ПЁТР – ПЯЦЮЛЯ.

ПАВАЖАНЫЯ ГОСЦІ ! А зараз паслухайце, калі ласка, вельмі цікавую гісторыю ўзнікнення назваў вёскі ПЕРШАМАЙСКАЯ, цяперашняга аграгарадка Першамайск.

ПА словах вядомага гісторыка і краязнаўца Мікалая Роўбы, сучасны аграгарадок ПЕРШАМАЙСК вядомы з 15 стагоддзя. Тады ён называўся ЗАБАЛОЦЦЕ. Назва гэта вельмі доўга адлюстроўвала прыродныя ўмовы тых мясцовасцей, але стварала многа путаніцы. Справа ў тым, што тапанімы ЗАБАЛАЦЬ, ЗАБАЛОЦЦЕ вельмі распаўсюджаны ў БЕЛАРУСІ. Так, ў Шчучынскім раёне на сённяшні дзень існуе вёска ЗАБАЛАЦЬ у МАЖЭЙКАЎСКІМ і ЗАБАЛОЦЦЕ ў НАВАДВОРСКІМ сельскіх Саветах. Мала таго - у дзесяці кіламетрах ад старажытнай вёскі ЗАБАЛОЦЦЕ знаходзілася мястэчка ЗАБАЛАЦЬ сучаснага ВОРАНАЎСКАГА раёна. Пагэтаму, калі ў 1550 годзе вёска ЗАБАЛОЦЦЕ была перададзена перабежчыку з МАСКВЫ баярыну МІХАІЛУ САБАКІНУ, то мясцовае насельніцтва пачало называць вёску САБАКІНЦЫ, ад прозвішча новага ўладальніка. Аднак ёсць і другая версія. Па паданню, калісьці тут адпачываў кароль, які прыязджаў сюды на паляванне. Пагэтаму і назва вёскі САБАКІНЦЫ прышло ад былой тут каралеўскай псярні. Пад назвай САБАКІНЦЫ вёска праіснавала болей трохсот гадоў і нават нейкі час лічылася мястэчкам. Але ў другой палове 18 стагоддзя грубая мужыцкая назва "САБАКІНЦЫ" пачало дрэнна ўспрымацца далікатным шляхецкім вухам. На гэта паўплывала мінулае барскае захапленне антычнай культурай і французскім асветніцтвам. Каб надаць САБАКІНЦАМ болей прыгожае гучанне, шляхта пачала прымяняць у 18 стагоддзі новую форму -

СОБОКІНЦЫ. Але сяляне не разумелі панскай назвы вёскі і прытрымліваліся адпаведнай беларускай мове фанетыцы - САБАКІНЦЫ.

У шасцідзесятых гадах 19 стагоддзя з боку праваслаўных святароў з'явілася прапанова перайменаваць САБАКІНЦЫ ў сяло ПАКРОЎСКАЕ ці проста ПАКРАВА, ад назвы тутэйшай царквы ПАКРАВА ПРЫСВЯТОЙ БАГАРОДЗІЦЫ. Ідэя гэта абмяркоўвалася амаль 30 гадоў, на працягу якіх мястэчка называлася то САБАКІНЦЫ, то ПАКРОЎСКАЕ. У канцы канцоў 13 верасня 1899 года губернскае праўленне ў ВІЛЬНЮСЕ канчаткова зацвердзіла новую назву - ПАКРОЎСКАЕ. Не паспела насельніцтва да яго прывыкнуць, як пачаліся войны, рэвалюцыі і паўстанні 1914 – 1920 гадоў, у выніку якіх ШЧУЧЫНШЧЫНА стала часткай ПОЛЬСКАГА КНЯСТВА. Новыя ўлады адразу адказаліся ад назвы ПАКРОЎСКАЕ, якое напамінала аб скучных часах РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ, і вярнуліся да старога – САБАКІНЦЫ. Але скора польскім чыноўнікам таксама не прышлася па душы гэта назва. Скора ў сярэдзіне трыццатых гадоў 20 стагоддзя з'явіўся праект перайменавання САБАКІНЦЫ ў НАРБУТОВА - у гонар аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863 – 1864 гадоў ЛЮДВІГА НАРБУТА. Пасля палемікі ў друку 2 ліпеня 1939 года прайшло афіцыйнае свята прыдання мястэчку новай назвы - НАРБУТОВА. Але не паспела высахнуць фарба на новых вывесках, як у верасні 1939 года ўспыхнула другая сусветная вайна, першай ахвярай якой стала ПОЛЬШЧА. І трох месяцаў не пабыўшы НАРБУТОВЫМ, мястэчка ізноў стала называцца САБАКІНЦЫ. Пад гэтай назвай яно перажыло цяжкія гады ваеннага ліхалецця.

У 1944 годзе ў ШЧУЧЫНСКІ РАЁН канчаткова прыйшла САВЕЦКАЯ УЛАДА. У пачатку 1950 – ых гадоў, пасля аднаўлення гаспадаркі, калектывізацыі і ліквідацыі так называемых "БАНД", новае кіраўніцтва звярнула ўвагу на непрыглядную назву аднаго з раённых сельскіх Саветаў - САБАКІНСКІ. Каб хутка рашыць гэтае пытанне, у 1954 годзе вёску САБАКІНЦЫ перайменавалі ў ПЕРШАМАЙСКУЮ, а мясцовы сельскі Савет стаў ПЕРШАМАЙСКІМ. Новыя назвы былі слушнымі і "ярка савецкімі". Так, добра ўсім вядомая вёска ПЕРШАМАЙСКАЯ праіснавала да 2012 года. У 2012 годзе вёска ПЕРШАМАЙСКАЯ рэарганізавана ў аграгарадок, які атрымаў назву ПЕРШАМАЙСК. Такім чынам, на працягу свайго пяцьсотгадовай гісторыі аграгарадок ПЕРШАМАЙСК змяніў 7 назваў: ЗАБАЛОЦЦЕ, САБАКІНЦЫ, СОБОКІНЦЫ, ПАКРОЎСКАЕ, НАРБУТОВА, ПЕРШАМАЙСКАЯ, аграгарадок ПЕРШАМАЙСК. Наогул, гэта незвычайнае дасягненне. Такім чынам, ПЕРШАМ АЙСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ , мы, жыхары яго, можам смела звярнуцца ў вядомую кнігу рэкордаў Г І Н Э С А. Хто ведае, можа ганаровая старонка там будзе забяспечана нам. Няхай ведаюць нашых!